Коллектив учителей
Краснослободской санаторной школы-интерната

# Урок па тэме «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся»

***Мэты:***

- актуалізаваць веды дзяцей пра – Беларусь, яе прыроду, рамёствы, родную мову і славутых землякоў;
- развіваць творчае мысленне, маўленне, эстэтычны густ;
- выхоўваць патрыятызм, пачуцці нацыянальнай годнасці і гонару за сваю Радзіму.

***Эпіграф:***

*Я ганаруся роднай Беларуссю, яе старажытнай*
*гісторыяй, яе разумным і гордым народам.*
*А. Р. Лукашэнка*

***Абсталяванне ўрока:***

геаграфічная карта РБ, дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь, відэамагнітафон, касеты, запіс песні «Мой родны кут», выстава кніг, партрэты знакамітых людзей, саматканы дыван, ільняныя ручнікі, кветкі.

***Тып урока***: вусны часопіс

(урок падрыхтаваны сумесна з іншымі настаўнікамі школы ў форме вуснага часопіса.)

***Вядучы:***

– Дзень добры, паважаныя сябры!

Вітаем Вас у Краснаслабодскай санаторнай школе-інтэрнаце. Наш першы ўрок Дня ведаў мае назву «***Жыву ў Беларусі і тым ганаруся***».

Якая яна, наша зямля? Настаўнікі нашай школы падрыхтавалі для вас вусны часопіс, які дапаможа вам у вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны роднай краіны і яе сучасных дасягненняў, паможа прадумаць і зрабіць практычны ўклад у працвітанне нашай дзяржавы.

***Вядучы*** *(чытае верш Н.Гілевіча «Я– беларус!»)*

*Я – беларус, я нарадзіўся*
*На гэтай казачнай зямлі,*
*Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх*
*Адвеку прашчуры жылі.*

*Я – беларус, я ганаруся,*
*Што маю гэтае імя:*


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

*Аб добрай славе Беларусі*
*У свеце знаюць нездарма!*

*Я – беларус, і я шчаслівы,*
*Што маці мову мне дала,*
*Што родных песень пералівы*
*І зблізку чую, і здаля...*

– Першую старонку нашага часопіса, якая называецца «***Беларусь на карце Еўропы***», прадстаўляе настаўніца пачатковых класаў Пігаль С.У.

***Пігаль С. У.***:

– Наша краіна размяшчаецца ў самым цэнтры Еўропы. Яе плошча складае больш за 207 тысяч квадратных кіламетраў. Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў. Гэта становішча спрыяе развіццю гандлёвых і культурных зносін з іншымі краінамі, а лёс нашага народа цесна пераплятаецца з лёсам народаў суседніх краін. Хто ж нашы суседзі? З Беларуссю мяжуюць *Расія, Украіна, Польшча, Літва і Латвія.* Вось як пра гэта сказаў паэт Юрась Свірка:

*Мяжуе з Польшчай, Украінай,*
*Расіяй, Латвіяй, Літвой.*
*Твой родны край, твая Айчына –*
*Жыццё тваё і гонар твой.*

(Ю.Свірка.Твая Беларусь)

На палітыка-адміністрацыйнай карце адлюстраваны межы шасці абласцей Беларусі: *Брэсцкай, Віцебскай,Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай.*

Хто з вас можа паказаць іх? (Дзеці паказваюць на карце)

Усе багацці нашай краіны ствараюцца яе працавітымі, таленавітымі людзьмі. Колькі нас, жыхароў Беларусі? У нашай рэспубліцы пражывае каля 10 мільёнаў чалавек.

***Вядучы:***

– Як і кожная незалежная краіна, Беларусь мае сваю ***дзяржаўную сімволіку***. Інфармацыя аб гэтым змешчана на другой старонцы нашага часопіса, якую прэзентуе нам настаўніца англійскай мовы В. Д. Асанава. (Відэазапіс інагурацыі Прэзідэнта, гімн).

***Асанава В.Д.:***

– З даўніх часоў людзі карыстаюцца знакамі, якія ў кароткай, нагляднай форме адлюстроўваюць тое, што асабліва дорага для іх, – Радзіму. Такімі знакамі-сімваламі з'яўляюцца герб, сцяг і гімн.


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

Кожная дэталь дзяржаўнай сімволікі мае важнае значэнне і дае зрокавыя, наглядныя і ў той жа час важныя звесткі пра нашу краіну, пра наш народ.

Галоўны сімвал нашай Радзімы – Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Ён мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы. А ці ведаеце вы, што абазначае кожны колер?

*(Адказы вучняў).*

Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя повязі, брацтва, барацьбу за справядліваю справу. Ён азначае высокае прызначэнне ў лёсе і перамогу. Адначасова гэта знак шчаслівага жыцця.

Зялёны колер – гэта колер Прыроды, нашай карміцелькі, нашай першамаці. Гэта колер палёў і лясоў, якія здаўна займалі асноўную частку тэрыторыі нашай краіны. Зялёны колер – колер дабра, росту, развіцця, дабрабыту і міру.

Нарэшце, белы колер – гэта перш за ўсё колер свабоды. Недарэмна лічаць, што назва нашай краіны – Беларусь – звязана з непахіснай воляй да свабоды.

Існавала, як вядома, і Чорная Русь: так умоўна азначаўся край славянскіх плямёнаў, які быў захоплены ворагамі. Разам з тым белы колер – гэта колер маральнай чысціні і мудрасці.

Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную, характэрную рысу, яшчэ адну важную дэталь -– гэта чырвоны народны ўзор ці, інакш кажучы, арнамент.

Што азначае гэты арнамент? Што ён сімвалізуе? Перш за ўсё – працавітасць і працоўнае майстэрства. У цэнтры арнаменту – ромб з тоўстымі «кручкамі», ці «рагамі», якія азначаюць вечнасць і рух. А сам ромб – гэта старадаўняя выява багіні Зямлі і Урадлівасці.

У сваёй гісторыі беларусы карысталіся рознымі сцягамі і гербамі. Цяперашнія герб і сцяг РБ прыняты ў выніку ўсенароднага галасавання 14 мая 1995 года.

Высветліць народную думку па сцягу і гербу Рэспублікі прапанаваў першы беларускі Прэзідэнт А.Р.Лукашэнка.

Герб, сцяг і гімн лічацца ва ўсіх краінах вышэйшымі сімваламі народа, іх шануюць, як роднае слова, родны дом, родную культуру і звычаі.

Дзяржаўная сімволіка ўпрыгожвае ўрадавыя ўстановы, як бы афармляе іх паўнамоцтвы. Усе важнейшыя дакументы і пячаткі ўтрымліваюць выяву Дзяржаўнага герба. На ўсіх значных пасяджэннях гучыць гімн, яго слухаюць стоячы. *(Відэазапіс).*

***Вядучы:*** *Мая Радзіма -*
*Дзе з-за бору*
*Узыходзіць месяц уначы,*
*Дзе ў братнім ладзе, у дружным зборы*
*Жылі калісьці крывічы.*
*Рабілі зрубы залатыя,*
*Нарогі, гонкія чаўны*
*І сцены белыя Сафіі*
*Над плынню быстрае Дзвіны.*


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

Гэтыя словы з'яўляюцца эпіграфам да наступнай старонкі нашага часопісу «***Ганарымся культурнай спадчынай***».

Яе для нас падрыхтавала настаўніца працоўнага навучання Трухан Тамара Канстанцінаўна.

*(Відэазапіс)*

***Трухан Т.К.:***

– Архітэктуры – гэта летапіс гісторыі народа ў дрэве і камені. Крэпасці і замкі, ратушы і храмы ў сваіх лепшых узорах адлюстроўваюць талент народа, які стварыў іх.

Архітэктурная спадчына – невычэрпная крыніца творчай фантазіі пакаленняў, якая дае нам выдатныя ўзоры дасканаласці кампазіцыйных вырашэнняў і багацця формаў. Гэта застылая музыка пакаленняў.

*1. Відэафрагмент "Сафійскі сабор у Полацку".*

Жамчужына беларускай архітэктуры пачатку 11 стагоддзя – Сафійскі сабор у Полацку. Гэта быў галоўны будынак не толькі сталіцы, але і ўсяго княства. Сафійскі сабор быў цэнтрам і духоўнага, і дзяржаўнага жыцця княства. Тут праходзілі богаслужэнні, узносіліся малітвы, працавалі іканапісцы, была сабраная багатая калекцыя кніг і летапісаў, працавала школа.

*2. Інтэр'ер (відэазапіс)*

У цяперашні час Сафійскі сабор функцыянуе як храм духоўнай культуры. Тут праходзяць канцэрты арганнай музыкі.

Развіццё беларускай архітэктуры адбывалася ў складаных гістарычных умовах. Частыя войны, міжусобіцы, ваенныя пагрозы з боку крыжаносцаў і татар сфармавалі абарончы воблік архітэктуры.

*(3. Белая вежа (агульны выгляд) відэафрагмент)*

Да сённяшніх дзён захавалася вежа ў Камянцы (13 ст.), круглая ў плане, таўшчыня сценаў – 2,5 м. Яна не мае якіх-небудзь архітэктурных упрыгожванняў – толькі абарончага прызначэння.

*4. Камянецкі стоўп «Галоўны ўваход» (відэазапіс)*

Галоўны ўваход у вежу размяшчаўся на адлегласці 10 м ад зямлі.

*5. Камянецкая вежа (відэазапіс)*

Вежа ўвенчана байніцамі, дзе стаялі воіны-лучнікі і арбалетчыкі, якія адбівалі атакі ворагаў.

*6. Лідскі замак (відэазапіс)*

Надзвычай складаны гістарычны лёс Лідскага замка. Яго сцены не аднойчы вытрымлівалі націск крыжаносцаў, крымскіх татар.

Не абышла яго і Вялікая Айчынная вайна. У чэрвені 1941 года на Ліду пасыпаліся фашысцкія бомбы. У замку трымалі ваеннапалонных, потым яго ператварылі ў склад боепрыпасыў. Тут часта ўзрываліся снарады, але сцены,


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

умацаванні засталіся непашкоджанымі, засталіся стаяць нямымі сведкамі злачынства.

Зараз тут вядуцца рэстаўрацыйныя работы. Плануецца размясціць на тэрыторыі замка рыцарскія клубы, а ў вежы арганізаваць выставу-экспазіцыю даспехаў і археалагічных знаходак.

*7. Замак у Косава. 1838г. (відэазапіс)*

Гэта адзін з самых маладых замкаў на тэрыторыі Беларусі.

Па ацэнках спецыялістаў, яго рэстаўрацыя абыдзецца ў 7 млн. $ ЗША.

*8. Замак у Нясвіжы. (відэазапіс)*

Гэта былая рэзідэнцыя князёў Радзівілаў. У 12 залах размяшчалася бібліятэка на 20 тысяч тамоў, партрэтная і карцінная галерэі, якія налічвалі больш за 1000 палотнаў, багатая калекцыя зброі, слуцкіх паясоў.

Рэстаўрацыю Нясвіжскага замка плануюць завяршыць у 2007 годзе.

*9. Мірскі замак (відэазапіс)*

Мірскі замак – гэта ўжо багаты палацава-замкавы комплекс, дзе на дзіва паспяхова спалучаліся рысы абарончага збудавання і мяккасць, велічнасць палацавай пабудовы.

У цяперашні час замак з'яўляецца адным з двух аб’ектаў Беларусі (другі – Белавежская пушча), занесеных у сусветны спис культурнай спадчыны ЮНЕСКА. У ліпені гэтага года тут адбыўся фэст мастацтваў «Мірскі замак - 2006».

У лік аб’ектаў – кандыдатаў у спис Сусветнай спадчыны ўваходзіць Сафійскі сабор у Полацку і Белая вежа ў Камянцы.

Мы здолелі захаваць і аднавіць шматлікія неацэнныя жамчужыны, скарбніцы беларускай культуры.

Шмат людзей працуе для таго, каб падымаць з руін замкі, уваскрашаць храмы. Велізарныя затраты часу, працы, грошай. А для чаго нам гэта патрэбна?

*Каб нам прынікнуць да крынічных вытокаў.*
*Каб памудрэць.*
*Каб пасталець.*
*з годнасцю мовіць: «Гэта мы, беларусы».*

***Вядучы:***

– Чацвёртую старонку нам прадставіць настаўніца беларускай мовы і літаратуры Герасімовіч Л. І.

***Герасімовіч Л.І.:***

– *Я* хачу спыніцца на духоўным багацці, ***духоўнай спадчыне беларусаў***.

Беларусь здаўна вядома як краіна вялікіх асветніцкіх традыцый. Захаваліся сведчанні, што цікавасць до навучання, асветы праявілася ў нашых продкаў яшчэ ў 9 ст. Менавіта тады быў створаны славянскі алфавіт, аўтарамі якога


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

былі два манахі-браты, балгарскія асветнікі Кірыл і Мяфодзій. Гэта яны ў 863 годзе склалі новы алфавіт, у аснову якога паклалі частку грэчаскіх літар, астатнія прыдумалі самі і пераклалі на славянскую мову некалькі грэчаскіх кніг. На кірыліцы яшчэ да ўзнікнення беларускага кнігадрукавання ствараліся старажытныя помнікі пісьменства – жыціі, летапісы. Па гэтых творах вучыліся грамаце нашы продкі.

Самай яркай асобай, якая клапацілася аб адукацыі і шчасці беларускага народа, была Еўфрасіння Полацкая. Жыла яна ў 12 стагоддзі. Адказаўшыся ад багацця і раскошы, маладая князёўна пайшла ў манастыр, каб прысвяціць сваё жыццё служэнню Богу і народу. Еўфрасіння перапісвала кнігі, прадавала іх, а выручаныя грошы раздавала бедным. Яна заснавала ўнікальную бібліятэку Сафійскага сабора, якая, на жаль, была пазней страчана за гады войнаў. Еўфрасіння марыла, каб перапіскай кніг займаліся не адзінкі, а вялікая колькасць людзей. Дзякуючы нястомнай працы беларускай асветніцы значная колькасць беларусаў навучылася грамаце.

Геніяльным прадаўжальнікам асветніцкіх ідэй быў Кірыла Тураўскі (1130-1182), які таксама прысвяціў сваё жыццё служэнню Богу і простаму народу. Яго ўзнёслыя “словы”-пропаведзі, малітвы, павучэнні прыходзілі паслухаць людзі з далёкіх куткоў славянскіх зямель. За красамоўства Кірылу Тураўскага празвалі Златавустам.

Выдатным асветнікам-гуманістам 16 ст. па праву лічаць Ф. Скарыну, які стварыў друкаваны варыянт кірыліцы і даў нам першыя друкаваныя на старажытнай беларускай мове царкоўныя кнігі. Скарына застаўся ў гісторыі народа і як таленавіты вучоны, пісьменнік-публіцыст, перакладчык, чалавек невычэрпнай энергіі і ініцыятывы.

16 стагоддзе дало беларусам і такога выдатнага асветніка як Сымон Будны. Яго пару належыць каля 25 прац, напісаных на розных мовах – лацінскай, польскай, беларускай, якія прынеслі яму вядомасць не толькі на радзіме, але і ў Заходняй Еўропе. Будны бязлітасна высмейваў духавенства за яго лжывасць, невуцтва, прагнасць да багацця. Пра гэта ён гаварыў у сваёй прадмове да кнігі “Катэхізіс”, якую надрукаваў у г.Нясвіжы ў 1562 г.

Паплечнікамі С.Буднага ў барацьбе за ідэі патрыятычнага служэння народу былі Васіль Цяпінскі, браты Мамонічы, Пётр Мсціславец.

Аўтарам першага беларускага буквара быў вядомы педагог 17 стагоддзя Лаўрэнцій Зізаній.

Плеяду выдатных асветнікаў Беларусі працягвалі Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, а ў больш познія часы – Іван Насовіч, Браніслаў Тарашкевіч, Яфім Карскі, Цётка, Я. Купала, Я. Колас і іншыя выдатныя асветнікі беларускай зямлі. Гэта дзякуючы ім мы маем сёння такую багатую духоўную спадчыну.

*(Настаўніца звяртаецца да выставы кніг і акцэнтуе ўвагу вучняў на помніках беларускага пісьменства).*


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

***Вядучы:***

-Якая яна, мая зямля?

Гэта ў мінулым гераічная, шматпакутная зямля. Безліч разоў грукаталі па ёй калясніцы вайны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі не была агрэсарам.

Іншая справа, што яна заўсёды мужна, да канца бараніла сваю праўду і веру. Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Дый як іначай, калі кожны трэці жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. Пра гэта нам раскажа настаўніца рускай мовы і літаратуры Сячко Н.С.

***Сячко Н.С.:***

– Не адну вайну прыйшлося перажыць беларусам, але самай страшнай, самай трагічнай стала, як вы думаеце, якая? Правільна, Вялікая Айчынная вайна.(Фрагмент відэазапісу, гучыць песня "Священная война").

Беларусь адна з першых прыняла магутны удар, накіраваны гітлераўскай Германіяй на СССР. Страшэнны лёс рыхтаваўся беларускаму народу: намячалася выселіць і знішчыць 75% насельніцтва, а астатніх – анямечыць і выкарыстоўваць у паднявольнай працы.

Першы ўдар прыйшоўся на гарнізон Брэсцкай крэпасці. Вораг разлічваў захапіць крэпасць у першыя гадзіны вайны, але апошнія яе абаронцы гераічна змагаліся да канца ліпеня 1941 года. Жорсткія баі ішлі па ўсёй тэрыторыі нашай краіны. Фашысты знішчылі ці вывезлі ў Германію культурную і гістарычную спадчыну беларускага народа.

Сімвалам вялікай трагедыі, што на вякі захоўваецца ў народнай памяці, з'яўляецца Хатынь, гэтак жа, як і Брэсцкі мемарыял, Курган Славы. Званы Хатыні звоняць над могілкамі 186 вёсак, дзе не засталося ніводнай сям'і, дзе не збудавана на папялішчы ніводнай новай хаты. Кожны трэці беларус загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны.

Цяжкі быў шлях да перамогі, але народ вытрымаў і перамог. Мы павінны памятаць пра гераізм беларусаў і зрабіць усё, каб гэта ніколі не паўтарылася, бо самае дарагое на зямлі – мір.

***Вядучы:***

– Спустошаная вайной краіна ажывілася працаю тых, хто выжыў і перамог, і таму цяпер:

*Тут умельцы выраблююць*
*Слаўны трактар «Беларусь»*
*Тут ствараюцца БелАзы –*
*Трохсоттонны вязуць груз...*

Як вы ўжо зразумелі з эпіграфа, на наступнай старонцы вы пачуеце пра дасягненні народнай гаспадаркі нашай краіны. Настаўніца нямецкай мовы Уласовіч С. У. пазнаёміць вас з гэтым.


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

***Уласовіч С. У.:***

– Сёння кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа ганарыцца дасягненнямі сваёй краіны ў эканоміцы: Беларусь лідзіруе ў СНД па вытворчасці тэлевізараў, халадзільнікаў, тканіны і абутку, займае першае месца па вытворчасці на душу насельніцтва цукру-пяску.

Галоўным у развіцці гаспадаркі стаў выраб машын. Іх выпускаецца многа і самых разнастайных. Гэта – грузавыя аўтамабілі, станкі, прыборы, трактары, тэхніка для сельскай гаспадаркі. На дарогах можна бачыць шматтонныя грузавікі – прадукцыю беларускіх заводаў.

Магутныя самазвалы аўтамабільнага завода ў Жодзіне – БелАЗы працуюць у кар'ерах па здабычы карысных выкапняў далёка за межамі рэспублікі. А беларускія МАЗы возяць грузы па дарогах свету.

У многіх краінах вядомы трактар «Беларус» Ён універсальны, бо здольны выконваць розныя віды работ: араць, баранаваць, сеяць, збіраць ураджай.

А колькі розных айчынных тавараў вакол нас: на рабоце, дома, у школе! Гэта тэлевізары, халадзільнікі, гадзіннікі, вылічальныя і электронная тэхніка. Шмат тавараў вырабляецца з дрэва: мэбля, запалкі, будаўнічныя матэрыялы, папера. Беларусь славіцца сваімі льнянымі, суконнымі і шаўковымі тканінамі, абуткам. Шырока вядомы хімічныя валокны, шыны, мінеральныя ўгнаенні, пластмасы.

Сельская гаспадарка забяспечвае насельніцтва разнастайнымі прадуктамі харчавання. З чаго пякуць смачны, духмяны хлеб? Вядома, з жыта. Яно – галоўная культура ў краіне. Значнае месца на нашых палях займае бульба. Яе нездарма завуць другім хлебам. З бульбы гатуюць мноства страў. Хто з вас не любіць, напрыклад, дранікі, чыпсы, крэкеры. Бульба таксама добры корм для жывёлы і сыравіна для іншых прадуктаў.

Блакітныя хвалі квітнеючага льну часцей за ўсё можна ўбачыць на поўначы рэспублікі. З-за гэтага яго завуць паўночным шоўкам.

Каб збіраць высокія ўраджаі, хлебаробам неабходны мінеральныя ўгнаенні. Іх вырабляюць з каменнай солі.

Існуе такая легенда. Шмат горкіх слёз пралілі тут раней нашы продкі. Слязамі, арасілі зямлю. Глыбока ў зямлю зацяклі яны. І ўтварылася там з людскіх слёз салёнае мора. А потым ператварылася яно ў соль зямлі. Побач з залежамі калійных солей узнік горад Салігорск. Шахцёры сталі здабываць гэтыя падземныя багацці, а хімікі – іх перапрацоўваць. А ў шахтах, пад зямлёй, знаходзіцца яшчэ адно багацце – унікальная, адзіная ва ўсёй Еўропе лячэбніца, дзе вельмі паспяхова лечаць захворванні органаў дыхання.

Разам з развіццём прамысловасці ўзніклі новыя гарады: Светлагорск, Наваполацк, Жодзіна, Новалукомль, Белаазёрск.

Што вы ведаеце пра гэтыя гарады? Раскажыце, калі ласка! *(Дзеці расказваюць)*


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

***Вядучы:***

Усе гэтыя дасягненні ў гаспадарцы былі б немагчымы без плённага развіцця навуковага патэнцыялу. А «храмам навукі» з'яўляецца Нацыянальная бібліятэка, пра якую раскажа бібліятэкар нашай школы Канчак Галіна Мікалаеўна.

***Канчак Г.М.:***

– Сёння амаль ва ўсіх сталіцах Заходняй Еўропы ёсць, як мінімум, адзін арыгінальны будынак, які з’явіўся пасля Другой сусветнай вайны і які робіць гэты горад вядомым, вылучае яго сярод іншых. Сваё законнае месца сярод іншых еўрапейскіх сталіц Мінску памог заняць Алмаз ведаў, які стаў ўжо адным з сімвалаў нашай сталіцы, візітнай карткай не толькі Мінска, але і Беларусі.

Будынак толькі пачынаў узводзіцца, а яго ўжо называлі яркім ўпрыгожаннем сучаснай Беларусі і дадавалі: «Наш алмаз».

Нацыянальная бібліятэка прыцягвае да сябе ўвагу здалёк. Нядзіўна, што і госці сталіцы, і самі мінчане абавязкова знаходзяць час, каб палюбавацца ўнікальным будынкам, яго велічнымі і зручнымі заламі, ацаніць малюнкі сучасных мастакоў, чые працы ўпрыгожваюць галерэі і калідоры бібліятэкі.

Былая галоўная бібліятэка краіны была заснавана ў 1921 годзе, тады яна з'яўлялася часткай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1926 годзе бібліятэка БДУ стала Беларускай дзяржаўнай. Чатырнаццаць гадоў назад бібліятэка атрымала статус Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Будаўніцтва сучаснага будынка пачалося ў 2002 г. У чэрвені 2006 года нацыянальная бібліятэка ганарова адзначыла сваё наваселле.

*(Паказваецца маляўнічая фатаграфія Нацыянальнай бібліятэкі).*

Агульная плошча будынка – звыш 112 тысяч кв. м. Вакол бібліятэкі разбіты парк з фантанамі і вітымі сцежкамі. Вышыня архітэктурнага шэдэўра адпавядае 24-му паверху жылога дома.

Панарамны ліфт хутка будзе падымаць гасцей на цэлыя 72 метры – самую высокую кропку Мінска, адкуль можна будзе палюбавацца краявідамі сталіцы.

“Алмаз ведаў” – гэта фондасховішча, разлічанае на 35 мільёнаў адзінак.Сярод іх ёсць сапраўдныя жамчужыны: 10 кнігаў Бібліі, выдадзеных Ф. Скарынай, першыя беларускія газеты «Мужыцкая праўда», «Наша доля», «Наша ніва», старажытныя карты, датаваныя 17 стагоддзем.

У фондзе бібліятэкі захоўваецца каля 70 тысяч кніг на шматлікіх жывых і мёртвых мовах, выдадзеных, як тыпаграфіяй, так і ручным спосабам. Тут сабраны кнігі з аўтографамі славутых людзей – Э.Золя, М.Цвятаевай, М.Шагала, М.Багдановіча, П. Пікаса і інш.

Самы старажытны помнік бібліятэкі – арабскі рукапіс канца 14 стагоддзя.

Выкраданні каштоўных кніг не рэдкасць. Каб папярэдзіць непрыемныя сітуацыі, у канцылярыі бібліятэкі пайшлі на «хітрасць»: ва ўсе кнігі ўстаўлены мікрачыпы, якія ў момант паведамяць прысутным пра кражу.


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

Яшчэ адна навіна – тэleліфт, нешта накшталт невялікай ж/д, з дапамогай вазка, які рухаецца уверх-уніз па рэйках, і неабходная літаратура дастаўляецца чытачу на працягу 20 хвілін.

У Беларускай Нацыянальнай бібліятэцы створаны ўсё ўмовы для працы і адпачынку: фізкультурна-аздараўленчы комплекс з трэнажорнай залай, саунай, масажным кабінетам… Функцыянуе 19 чытальных залаў, устаноўлена каля 1,5 тыс. камп'ютэраў з ВК маніторамі і шмат іншага

Галоўная бібліятэка краіны – гэта бяздонная рака, ля вытокаў якой стаяць маленькія школьныя бібліятэкі.

Дзверы нашай бібліятэкі заўсёды паадчыняныя для вас, нашы паважаныя вучні!

***Вядучы:***

– Існуе прымаўка: «У здаровым целе – здаровы дух». Гэтыя словы актуальныя і зараз. А дзякуючы палітыцы нашага Прэзідэнта кожны мае магчымасць развіваць свае фізічныя здольнасці, весці здаровы лад жыцця.

З дасягненнямі беларускага спорту вас пазнаёміць настаўніца фізічнай культуры Воўна А.М.

***Воўна А.М.:***

– Галоўная падзея мінулых 4 гадоў – алімпіяда ў Афінах – ужо гісторыя. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка засведчыў:

«Як кіраўнік дзяржавы і Нацыянальнага алімпійскага камітэта, я даў высокую ацэнку спартсменам, якія паспяхова выступілі на гульнях, перш за ўсё – Юліі Несцярэнка і Ігару Макараву, іх трэнерам. Сёння яшчэ раз выказваю ім падзяку за майстэрства і мужнасць у надзвычай складанай канкурэнтнай барацьбе. Яны годна прадставілі нашу краіну на вышэйшым спартыўным форуме планеты і паказалі выдатныя вынікі. Узгадайце, які міжнародны рэзананс атрымала перамога Юліі Несцярэнка на Алімпійскіх гульнях. Ад яе былі ў захапленні не толькі нашы суайчыннікі – мільёны тэлегледачоў ва ўсім свеце».

21 жніўня 2004 г. у Афінах пазначана, бадай, самай большай сенсацыяй Гульняў: беларуская дзяўчына з Брэста Юлія Несцярэнка, за 15 метраў да фінішу апярэдзіўшы амерыканскую легкаатлетку Лорын Уільямс, з вынікам 10,93 секунды заваявала залаты медаль у бегу на 100 метраў! Упершыню з 1980 года пераможцам на стометроўцы стала спартсменка не з ЗША! Шакіраваная прэса наперабой ухваляла чэмпіёнку: «20 гадоў свет жаночага спрынту знаходзіўся пад уладай суровага амерыканскага рэжыму. Але ў суботу гегемоніі прадстаўніц ЗША прыйшоў канец. Белая маланка (так празвалі спартсменку) абагнала цёмнаскурых спартсменак, якія традыцыйна дамінавалі ў гэтай дысцыпліне».

Элемент выпадковасці быў выключаны: ад раунда да раунда Юлія Несцярэнка здолела чатыры разы пераўзысці гросмайстарскі 11-секундны рубеж!


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

(*Фрагменты відэазапісу)*

Першы поспех да Ігара Макарава прыйшоў яшчэ ў школе, калі ён выйграў юначае першынство Беларусі. Пасля яшчэ адно і яшчэ...

У зборную краіны 19-гадовага спартсмена запрасілі ў 1998 г. – пасля сярэбранага медаля на маладзёжным першынстве Еўропы. З таго моманту поспехі таленавітага дзюдаіста не заставаліся незаўважанымі. Адстойваючы гонар узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, Ігар заняў другое месца на чэмпіянаце свету сярод вайскоўцаў, а затым выйграў Сусветныя гульні.

17 гадоў марыў гомельскі спартсмен аб алімпійскім золаце. 17 гадоў ён ішоў да яго сваім шляхам. І быў увенчаны медалём і аліўкавай галінкаю акурат на радзіме першых Алімпійскіх гульняў. Праз 108 гадоў пасля іх адраджэння...

(*Фрагменты відэазапісу)*

На гульнях 28 Алімпіяды у Афінах летам 2004 г. каманда Беларусі заваявала 15 медалёў (2 залатыя, 6 сярэбраных і 7 бронзавых) і заняла ў неафіцыйным заліку 26-е месца, а па агульнай колькасці медалёў – 18-е. Усяго у гэтых гульнях прынялі ўдзел каманды з 201 краіны свету.

Маладая і новая на карце свету краіна Беларусь на Алімпіядзе апярэдзіла многія эканамічна моцныя краіны, якія мелі шматгадовы вопыт удзелу ў спаборніцтвах падобнага рангу, якія не зведалі разрушальных гістарычных і эканамічных крызісаў, цяжкіх войнаў, рэвалюцый, перастроек і чарнобыльскай трагедыі.

Кожныя новыя Алімпійскія гульні называюць новых герояў, спартсменаў, якія праяўляюць не толькі талент, фізічныя якасці і тэхніку, але і сілу волі, мэтанакіраванасць, патрыятызм. А ці любіце спорт вы? Назавіце імёны вядомых спартсменаў.

(Максім Мірны, Уладзімір Ваўчкоў, Іван Іванкоў, Александр Каршакевіч, Сяргей Алейнікаў, Эдуард Малафееў, Спартак Мірановіч, Катярына Карстэн, Уладзімір Алейнік, Яніна Карольчык, Наталля Цылінская)

***Вядучы:***

– Мы з вамі перагарнулі апошнюю старонку нашага часопіса. І мы спадзяёмся, што вы не засталіся абыякавымі, набылі новыя веды, а некаторыя з вас успомнілі вядомае. А вынікам будзе інтэрактыўная гульня.

### ***Інтэрактыўная гульня***

***Вядучы:***

1. З якой краінай мяжуе наша рэспубліка на захадзе?
2. Якія архітэктурныя помнікі Беларусі ўнесены ў сусветны спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА?
3. Каго з беларускіх асветнікаў празвалі Златавустам?
4. Хто напісаў словы і склаў музыку гімна Рэспублікі Беларусь?


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf

5. Хто больш назаве прадпрыемстваў, якімі славіцца наша краіна?

6. Назавіце імёны самых вядомых нашых сучаснікаў. Чым яны праславілі рэспубліку?

(Актыўныя удзельнікі гульні атрымліваюць падарункі)

***Вядучы:***

А закончыць наш урок мы хацелі б песняй «Белая Русь» у выкананні педагога-арганізатара Паўлюкевіч Марыны Анатольеўны.


© «Народная асвета», 2008, №6: www.n-asveta.com\dadatki\zyvu.pdf